информации, что обусловливается не только качеством знания (инновации), но и вектором его деонтологической направленности» [2, с. 197].

*Библиографические ссылки*

1. Белякова, Л. П. Мир газетного образа / Л.П. Белякова. – Мн. : БГУ, 2003. – 175 с.
2. Белякова, Л. П. Аналитическая журналистика в системе информационного обеспечения инновационных проектов / Л. П. Белякова ; науч. ред. проф. О. Г. Слука. – Минск : БГУ, 2013. – 215 с. – (Библиотека журналиста).
3. Падаляк, Т. У Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі / Т. У. Падаляк ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. –. Мінск : БДУ, 2016. – 263 с.

**Аксана Бязлепкіна-Чарнякевіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

## ЛІТАРАТУРНАЯ ТЭМАТЫКА НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА» Ў СІНХРАНІЧНЫМ І ДЫЯХРАНІЧНЫМ АСПЕКТАХ

У 1985 годзе тагачасны супрацоўнік газеты «Гомельская праўда» С. Дубавец у артыкуле «Пра “выхадцаў” і тых, хто застаўся» [3] назваў гомельскую пісьменніцкую арганізацыю (маецца на ўвазе рэгіянальны філіял Саюза пісьменнікаў БССР) слабай і растлумачыў гэтую слабасць тым, што пісьменнікі, стаўшы членамі СП альбо сціхаюць, альбо з’язджаюць у Мінск і ўжо не ўваходзяць у паняцце «літаратурная Гомельшчына».

Калі рэзюмаваць, то аўтар наракае на кволае літаратурнае жыццё ў рэгёнах і закранае пытанне цэнтралізацыі літаратуры: усіх лепшых, ярчэйшых пісьменнікаў «пераманьвае» сталіца.

Канец XX стагоддзя ў беларускім літаратурным працэсе быў пераходным перыядам: калі ў канцы 1980-х гг. яшчэ былі актуальным савецкія законы і правілы функцыянавання літаратурнага працэсу, то літаральна праз 10 гадоў статус літаратуры і пісьменніка цалкам змяніўся, у 2020-х гг. нарэшце намацваецца той шлях, якім будзе далей ісці літаратура без дзяржаўнага кіравання.

Адной з самых істотных змен стала дэцэнтралізацыя літаратурнага працэсу. У канцы XX ст. Саюз пісьменнікаў ужо не меў рэсурсаў, каб утрымліваць пісьменнікаў, працэс арганізаванага пераезду літаратараў з рэгёнаў у сталіцу спыніўся.

Якім чынам дэцэнтралізацыя літаратуры адлюстравалася на старонках «Гомельскай праўды»? Зробім кароткі агляд матэрыялаў

літаратурнай тэматыкі на старонках газеты «Гомельская праўда» за адзін месяц (студзень) трох розных гадоў: 1986, 1993 і 2019.

Таксама варта адзначыць, як змянілася мова выдання: у 1986 годзе газета была цалкам беларускамоўная, у 1993 годзе трапляюцца паасобныя матэрыялы на рускай мове, у 2019 годзе газета амаль цалкам выходзіць на рускай мове з малой колькасцю матэрыялаў на беларускай мове.

У 1986 годзе матэрыялы на культурную тэматыку (у тым ліку на літаратурную) змяшчаліся ў кожным нумары. На старонках газеты друкаваліся мастацкія творы: апавяданне М. Даніленкі «Журавінавая імшарына», які, дарэчы, на момант публікацыі з'яўляўся супрацоўнікам газеты (01.01.1986); нізкі вершаў на рускай і беларускай мовах (Э. Усціновіч «Зимой в лесу» ў нумары за 01.01.1986; нізка вершаў І. Аляксандрава «Такія светлыя ўзоры» – 25.01.1986) у атачэнні фота ці малюнкаў. Асобна выдзялялася старонка пад творчасць студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта «Крыніцы: старонка літаратуры і мастацтва», дзе былі надрукаваны творы А. Казлова, В. Ярца, Т. Мельчанкі, А. Шэпелевай, І. Тарасавай і іншых (17.01.1986).

З вышыні сённяшняга часу варта адзначыць, што колькасць прадстаўнікоў абодвух палоў прыкладна роўная, а вось вядомасці больш у выніку займелі мужчыны – А. Казлоў (пераехаўшы ў Мінск) і В. Ярац (застаўшыся ў Гомелі). У 1986 годзе ў газеце часта друкаваліся фельетоны, жанр на памежжы журналістыкі і літаратуры: так, фельетоны А. Усені ў нумарах за 14.01.1986, 15.01.1986, 24.01.1986 (аўтар паралельна займаўся ўласна літаратурнай дзейнасцю, друкаваў вершы, прозу, успаміны).

Рэцэнзіі на кнігі сустракаліся мала, заўсёды мелася для іх нейкая дадатковая падстава – размова на палітычна значную тэму (у рубрыцы «Новыя кнігі» артыкул «Карнік жыве ў Кліфтане» пра аднайменны зборнік нарысаў пра «фашысцкіх паслугачоў, што ўкрываюцца ў ЗША» (11.01.1986). Праз артыкулы на літаратурную тэматыку падкрэсліваліся сувязі з рускай літаратурай і літаратурамі рэспублік СССР: артыкулы «Аўтограф Расула Гамзатава» (01.01.1986), «Першая “Беларуская Ясенініяна”» (16.01.1986), таксама змяшчаліся артыкулы літаратурнакраязнаўчай скіраванасці (артыкул З. Зайцавай «…Каб застацца сабой» пра творчасць земляка М. А. Грамыкі (18.01.1986); артыкул «Удзячная памяць землякоў: у Журавічах адкрыты музей народнага пісьменніка БССР Андрэя Макаёнка», аўтар В. Ткачоў – спецыяльны карэспандэнт «Гомельскай праўды» (29.01.1986)).

У 1993 годзе не адбылося кардынальных змен ў рэдакцыйнай палітыцы па літаратурным пытанні: па-ранейшаму часам друкуюцца мастацкія тэксты, аўтары якіх часта супрацоўнікі рэдакцыі; нізкі рускамоўнай і беларускамоўнай паэзіі (прынагодныя (навагоднія) вершы М. Старчанкі і Г. Атрошчанкі, нарыс А. Лагуновіч «Куды ж нам плыць: суб'ектыўныя навагоднія нататкі» (01.01.1993); апавяданні «Рыжуха» члена Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь В. Дварчаніна (07.01.1993) і «Развітальнае» В. Лоўгача (23.01.1993); біяграфічная згадка «Знакомьтесь: Надежда Антипова» і нізкі рускамоўных вершаў А. Болматава і Н. Анціпавай (16.01.1993); рускамоўная нізка вершаў І. Журбіна (30.01.1993); эсэ М. Парахневіча «У няроўным паядынку» надрукавана ў двух нумарах, аўтарскае вызначэнне жанру не адпавядае сучаснаму разуменню жанру эсэ [1], гэта хутчэй нарыс (26.01.1993; 28.01.1993).

Друкуюцца юбілейныя матэрыялы, напрыклад, інтэрв'ю журналіста і пісьменніка В. Ткачова з М. Чарняўскім «Чалавечнасць: паэту-земляку Міколу Чарняўскаму – 50 гадоў». М. Чарняўскі на момант інтэрв'ю жыў у Мінску, што з'яўляецца цікавым фактам, калі памятаць пра артыкул С. Дубаўца пра «выхадцаў» (21.01.1993).

Рэцэнзіі і артыкулы на літаратурна-краязнаўчую і гісторыка-культурную тэматыку друкуюцца спарадычна, што, відаць, больш адлюстроўвае аўтарскія інтэнцыі, чым рэдакцыйную палітыку: нарыс А. Рогалева «Вуліца Пушкіна» – гэта асацыяцыі гісторыка-літаратурнага плана пра вуліцу Пушкіна ў Гомелі з літаратурнымі адсылкамі і цытаваннем вершаў (07.01.1993).

Рэцэнзіі на кнігі становяцца самастойным помнікам і сведкам таго часу. Так рэцэнзія на гістарычную кнігу М. І. Скрыннікава «Вайна і саветы» (23.01.1993) падпісана наступным чынам: М. Ражкоў, кандыдат філасофскіх навук, лектар таварыства «Веды». Аўтар просіць пералічыць ганарар у фонд падтрымкі «ГП».

У рэцэнзіі краязнаўцы А. Катэрлі на «Гісторыка-тапанімічны слоўнік Веткаўскага раёна», падрыхтаваны А. Ф. Рогалевым (05.01.1993) згадак пра грамадска-палітычную сітуацыю больш, чым уласна пра выданне: «І ўсё ж нягледзячы на «рыначныя» цяжкасці, навуковыя і навукова-папулярныя выданні па гістарычнаму краязнаўству, няхай і не ў такіх дыхтоўных вокладках, як замежныя дэтэктывы і «танная» фантастыка, таксама знаходзяць свайго чытача і карыстаюцца попытам». Сведчанні «Летапісу друку» за 1993 год пацвярджаюць крыўды навукоўцаў:

здарыўся ўздым выдавецкай і чытацкай цікаўнасці да замежнай масавай літаратуры.

У 2019 годзе газета «Гомельская праўда» знаходзіцца ў абсалютна іншай грамадска-палітычнай і інфармацыйнай прасторы, чым у ранейшыя гады. Газета стала каляровай і пераважна рускамоўнай.

На сайце газеты ёсць pdf-версія папяровай газеты і электронная версія, якія, што натуральна, не супадаюць. І ў моманты гэтага несупадзення сярод іншага трапляюць акурат тыя тэксты, якія нейкім чынам датычаць літаратуры. Напрыклад, рубрыка «Песня по заявкам» не змяшчаецца на сайце, бо відавочна, што пры жаданні чытачы могуць знайсці гэтыя тэксты ў інтэрнэце ў любы момант, а размяшчэнне гэтых савецкіх песень (у нашым выпадку – з навагодніх савецкіх фільмаў) у папяровай версіі – разлік на мэтавую аўдыторыю, якой з’яўляюцца пажылыя людзі, апанаваныя настальгіяй.

У рубрыцы «Літаратурная гасцёўня» (10.01.2019) змешчаны ўрывак з апавядання П. Раманенкі «Сустрэча», а таксама нізка рускамоўных і беларускамоўных вершаў А. Барысаглебскага, Л. Долбікавай, Р. Бабчанка, Г. Рагавой, Н. Шкляравай, Т. Купрэвіч, М. Болсуна, М. Старчанкі. У рубрыцы «На житейских перекрёстках» нарыс У. Жаўнова «Старый журавль» і нізкі вершаў (17.01.2019). Але на сайце гэтыя тэксты не выстаўлены (прынамсі, не знаходзіцца пошукам праз сайт і праз пошукавікі). Магчыма, не ўсе гэтыя тэксты першая публікацыя, як у выпадку з вершам Н. Шкляравай, які ўжо друкаваўся ў яе кнізе «Млён» [4]. Але наогул гэтая рубрыка на старонках газеты выглядае вядомым спосабам падымання тыражоў: кожны аўтар маленькага твора купіць некалькі асобнікаў, каб раздаць сябрам і блізкім.

У нумары за 17.01.2019 інфармацыя пра ўдзел гамяльчанкі Марыі Маліноўскай у Еўрапейскім фестывалі паэзіі (калі меркаваць па колькасці згадак гэтай паэткі ў «ГП», то відавочна, што тут індывідуальны падыход).

Такім чынам, прэзентацыя літаратурнай тэматыкі ў «Гомельскай праўдзе» адпавядае агульнабеларускім тэндэнцыям, звязаным у першую чаргу з грамадска-палітычнымі зменамі за апошнія 33 гады [2]. Літаратурны працэс дэцэнтралізаваўся: пры наяўнасці іерархіі было адчуванне, што апісанне літаратурнага працэсу самому гэтаму працэсу адпавядае, у часы дэцэнтралізацыі і ў несталічным рэгіёне можа быць многа варыянтаў. Насуперак меркаванню колішняга журналіста «ГП» С. Дубаўца тым пісьменнікаў, якія з’ехалі, і іх чытачам нагадваюць пра гомельскае паходжанне «выхадцаў» (матэрыялы да юбілеяў у

1986 годзе – І. Шамякіна, у 1993 – М. Чарняўскага). Нязменнымі засталіся наступныя моманты: выпадковае рэцэнзаванне мастацкіх, дакументальных, краязнаўчых і навуковых кніг, ёсць зацікаўленасць у літаратурных старонках унутры рэдакцыі (журналісты выступаюць як літаратары, а літаратары як журналісты).

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Бажок, І. Эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры: эвалюцыя, тэндэнцыі развіцця : аўтарэф. дыс. … канд.філал.навук : 10.01.01 / І. А. Бажок ; Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск, 2018. – 24 с.
2. Бязлепкіна, А. Статус пісьменніка / А. Бязлепкіна // 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – С. 173–174.
3. Дубавец, С. Пра «выхадцаў» і тых, хто застаўся / С. Дубавец // Гомельская праўда. – 1985. – 25 студзеня.
4. Шклярава, Н. Млён / Н. Шклярава. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 200 с.

**Виталий Герцев**

*Объединенная газета «Наш край» (г. Барановичи, Беларусь)*

## ЧТО В ИМЕНИ ТВОЕМ, ВЕЧЕРКА? К ВОПРОСУ О ЗАРОЖДЕНИИ И РАЗВИТИИ ВЕЧЕРНЕЙ ПРЕССЫ

Одна из наиболее актуальных в Республике Беларусь задач, реализация которых находится на контроле у Главы государства, – комплексное развитие региональных центров, таких городов, как Орша, Бобруйск, Барановичи, Борисов. Доказано, что городская среда и городская пресса находятся в отношениях взаимосвязи и взаимозависимости: издания являются не только зеркалом процессов, но одновременно и их катализатором [6, с. 10]. Усиление влияния СМИ на экономическую, политическую и социальную ситуацию констатируется в Концепции национальной безопасности Республики Беларусь, где отмечено, что «информационная сфера превращается в системообразующий фактор жизни людей, обществ и государств». Таким образом, городская пресса, формируя коммуникативную среду, оказывает значительное влияние на процессы и является одним из факторов устойчивого развития современного города.

Среди городских изданий обращают на себя внимание вечерние газеты – активно развивающийся и перспективный сегмент рынка печатных СМИ Республики Беларусь. Кроме «Вечернего Минска», старейшего в